...РОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 90 (1057) ПЯТНІЦА, 18-га красавіка 1930 г.

Працэс украінскай контррэволюцыі

Агэнты міжнароднай буржуазіі імкнуліся ўтварыць фэдэрацыю Украіны з фашысцкай Польшчай

З прамовы дзяржаўнага абвінавайцы тав. Міхайліка

Мы абвінавачаем вас—гаворыць в. Міхайлік, зьвяртаючыся да падсудных,—у тым, што вы—ідэолёгіі ...раінскай буржуазіі і кулацтва, ...енты міжнароднай буржуазіі, перш ... ўсё ў яе інтарэсах імкнуліся ні...ынуць савецкую ўладу, сыстэму і ...овы соцыялістычнага будаўніцт... Мы абвінавачваем вас у тым, ...о вы—органічная частка Пятлю...ўскай эміграцыі, сумесна з ёю і ...яе ўказаць утварылі адзіную ...нтррэволюцыйную організацыю, ...лі разьведчыкамі клясавага вора... на савецкай зямлі, што вы, вер...ыя лёкаі сусьветнай буржуазіі, ...аводзілі контррэволюцыйную ра...ту на яе сродкі, з дапамогаю яе ...іцыйных прадстаўнікоў на тэры...рыі Украіны. Мы абвінавачваем ...с у тым, што вы, прадстаўнікі ...рэакцыйнейшага фашызму, рых...налі поўную рэстаўрацыю капіта...лістычнага ладу.

Тых, хто складаў плян павароту ...льтуры і навукі назад к паслу... капіталізму, хто шукаў баявых ...нтррэволюцыйных дзеяньняў і ...варыў законсьпіраваную організа...ю „Спилку Вызваленья Украины"—вось каго судзіць вярхоўны ... Украіны.

Вось чаму такую інтэлігенцыю ...даўкі і пятлюраўскі лягер, поль...кая буржуазія лічаць сваёй і кры...чаць аб «небясьпецы» для «мозгу» ...раінскага народу, у сапраўднасьці—мозгу украінскай контррэво...цыі.

Хто яны—гэты, па выразу унда...ысцкай прэсы, „мозг украін...ай нацыі, яе самая сьвядомая ...стка"?

Сяргей Яфрэмаў—былы галава ...ртыі соцыялістых-фэдэралістых. ...рэмаў яшчэ ў 1920 годзе праз ...ідліха і тагочаснага начальніка ...нтрразьведкі Юзэфскага, як прад...аўнік БУД клапаціўся аб утва...ньні польска-пятлюраўскай дзяр...вы, санкцыянаваў выдачу галіцый...іх рабочых і сялян на зьдзекі ...льскім панам. Акадэмік Яфрэмаў 1920, 21, 22 г.г.—ідэолёг, кі...аўнік і бард самага злоснага ку...цкага бандытызму і ў пэўны час ...адзейная яўка для шпіёнаў. Ён 1923 годзе праз консульства су...днай дзяржавы законсьпіравана ...рапісваецца з членам зарубежнага ...Д Зайцавым адносна аднаўленьня ...ндыцкай работы на Украіне. Яфрэмаў ненавідзіць сёняшняга гегемо...жыцьця—пролетарыя.

Яфрэмаў, дзякуючы свайму вя...каму вопыту падпольнага контр...рэволюцыянэра, мог і павінен-бы ...даць галавой „СВУ".

Уладзімер Чахоўскі—былы член ... партыі ўкраінскіх соцыял-дэмо...кратаў, прэм'ер-міністр пятлюраў...а-Віньнічэнкаўскага ўраду, які ...ршы меў „вялікі" гонар уласна...чна падпісаць у 1918 годзе аб...шчэньне вайны рабочым і сялян...ам Расіі, а разам з гэтым і вай...і працоўным Украіны, у час ...эм'ерства якога конкрэтызаваліся ...гавары аб продажы Украіны ан...тэнце. Соцыял-дэмократ Чахоўскі, ...і на арэну палітычнай барацьбы ...цягнуў свайго легендарнага хрыс..., апрануў яго ў аўтокефальныя ...тлюраўскія рызы, уткнуў яму ў ...кі абрэз,—сымбаль кулацкай контррэволюцыі. Такой Чахоўскі мог стаць і стаў намесьнікам старшыні „СВУ".

Старыцкая - Чарняхоўская —член цэнтральнай рады партыі с.-ф. Яна прайшла з гэтай партыяй увесь яе ганебны і крывавы шлях. Старыцкая-Чарняхоўская, сумесна з Пятлюрай і Андрэем Лявіцкім, ад імя так званай украінскай грамадзкасьці ў Варшаве, на нарадзе украінскіх партый, угодліва паклала Галіцыю пад ногі польскіх паноў і санкцыянавала окупацыю Украіны войскамі Польшчы.

Старыцкая, якая пасьля разгрому польскага наступленьня і пятлюраўшчыны ўвайшла ў будаўскае падпольле, каб абараняць справу буржуазіі. Старыцкая, якая тут заяўляла, што ўсё жыцьцё яна прысьвяціла ідэі пятлюраўскай самасьційнасьці,—магла стаць і стала членам цэнтру „СВУ".

Тав. Міхайлік у далейшым дае падрабязговы аналіз гісторыі і дзейнасьці „СВУ".

Якія шляхі абрала „СВУ" для дасягненьня сваёй канчатковай мэты—зьнішчэньня савецкай улады?

Усе матар'ялы справы і паказаньні падсудных выразна гавораць аб адным: тэрор, паўстаньні і інтэрвэнцыя імпэрыялістычных дзяржаў.

Ставячы сабе мэтаю адарваць Украіну ад Саюзу Савецкіх Рэспублік, пятлюраўскі цэнтр за мяжой і «СВУ» ў падпольлі ў нас—уключылі ў сваю програму і лёзунг фэдэрацыі Украіны з фашысцкай Польшчай. Тварцы СВУ павінны былі садрацць з сябе нават фальшывыя лахманы самасьційнасьці і „нацыянальнай романтыкі", яны імкнуліся аддаць Украіну пад бот польскага пана.

У канцы сваёй вялікай прамовы дзяржаўны абвінавайца тав. Міхайлік гаворыць:

— Калі ўзважваеш увесь цяжар злачынстваў утвораных падсуднымі, калі ўглядаешся ў крывавае контррэволюцыйнае мінулае падсудных Яфрэмава, Чахоўскага, Нікоўскага, Дурдукоўскага і Ганцова, калі яшчэ раз аналізуеш страшэнныя пляны, выканаўцам якіх павінен быў стаць Паўлушкоў, дык становіцца ясным, што супроць гэтых людзей ёсьць адна мера соцыяльнай абароны—растрэл. Узважваючы-ж раскаяньне падсудных, палітычную і гаспадарчую моц савецкай рэспублікі, прокуратура згодна не настойваць выключна на гэтай меры соцыяльнай абароны. Няхай суд сам узважыць.

Выступленьні абароны

ХАРКАЎ, 17. На працэсе „СВУ" выступілі з прамовамі абаронцы Гродзінскі, Кавалеўская і Рыўнін.

Профэсар Гродзінскі—абаронца падсуднага Гэрмайзе, Кавалеўская абараняе членаў школьнай групы «СВУ»,—Рыунін абараняе падсудных Ганцова, Барбара, Падваеўскага і Чарняхоўскага.

Абаронцы, спасылаючыся на прызнаньне падсуднымі сваей віны, на тое, што яны былі мала актыўнымі контррэволюцыянэрамі, просяць суд даць магчымасьць падсудным справіцца і прынесьці карысьць на культурным фронце.

„Рукі прэч ад рабочай дзяржавы!

Латвія ўваходзіць у склад тых дзяржаў, якія рыхтуюць вайсковыя наступленьні супроць СССР"

РЫГА, 16. У спрэчках па ваеннаму бюджэту ў Латвійскім сойме выступіў соцыял-дэмократычны дэпутат Бруно-Калмыныш, які папракаў ваеннае кіраўніцтва ў тым, што яно недастаткова клапоціцца аб узбраеньні і навучаньні латвійскай арміі.

Дэпутат рабоча-сялянскай фракцыі Яршоў рэзка выступіў супроць удзелу Латвіі ў падрыхтоўцы новай вайны—вайны супроць СССР і ганьбіў паводзіны соцыял-дэмократаў. Зазначыўшы на супрацоўніцтва генэральных штабаў Латвіі і Польшчы, на вялікі процант былых рускіх белагвардзейскіх афіцэраў у складзе латвійскай арміі, на рост манархізму і вялікіх вайсковых асыгнаваньняў, Яршоў скончыў: „Латвія ўваходзіць у склад тых дзяржаў, якія рыхтуюць вайсковыя наступленьні супроць СССР. У падрыхтоўцы вайны, па меры сваіх сіл і здольнасьцяй, удзельнічаюць латвійскія соцыял-дэмократы. Рашуча протэстую супроць уцягваньня Латвіі ў вайну з СССР, заяўляю ад імя працоўных: „Рукі прэч ад рабочай дзяржавы"!

Навіны капіталістычнай тэхнікі

Новы ўрад Брунінга правёў праз Рэйхстаг павялічэньне цэлага шэрагу падаткаў. Гэты новы замаскаваны нажым на рабочую клясу Нямеччыны, зроблены ўрадам у карысьць сваім капіталістычным гаспадарам. (З газэт).



Новы прэс сыстэмы „Брунінг".

Часовая гандлёвая згода

ЛЁНДАН, 16. Сёньня ў 5 гадзін дню падпісана часовая гандлёвая згода паміж Англіяй і СССР.

Каля дамавіны рэволюцыйнага поэты Ул. Маякоўскага

МАСКВА, 16. Учора раніцою яшчэ задоўга да адчыненьня доступу к целу поэты Уладзімера Маякоўскага, доўгая чалавечая істужка працягнулася ад варот клюбу пісьменьнікаў. па вуліцы Ваўоўскага да пляцу Паўстаньня і завярнула на вуліцу Герцэна.

У гэтай істужцы—рабочыя, служачыя, студэнты ВНУ і тэхнікумаў чырвонаармейцы. Больш усяго моладзі—рабочых, вучняў.

Шмат дзяцей, якія прышлі організавана,—цэлымі піонэратрадамі, групамі з школ і дзетдамоў. Усе ўсходы і калідоры—у кветках. З кожнай хвілінай кветак становіцца ўсе больш,—іх прыносяць з сабой прышоўшыя.

Ваенны караул нясуць чырвонаармейцы Маскоўскай пролетарскай дывізіі, оркестр гэтай-жа дывізіі грае ўвесь час жалобны марш. Калі оркестр сьціхае, яго зьмяняе струнны квартэт, які грае ўсходнія пахавальныя песьні.

Каля памосту, за лаўкамі з сям'ёй і блізкімі сябрамі Маякоўскага—мастакі, якія малююць поэту ў дамавіне. К канцу рабочага дню жалобная чарга вырасла ў шмат тысяч чалавек, больш чым на квартал працягнуўшыся на вуліцы Герцэна.

Паміж рупарам елачных галін, чырвоных ці чорных палотнішчаў вяшчалі лёзунгі загінуўшага поэты: —«Все до самого последнего листка я отдаю тебе, планеты пролетарий»; „Не взять нас буржуевым гончим. Вперед пятилетку—в четыре года, выполним вымчим, закончим!"; „Нам общим памятником будет построенный в боях социализм".

Як і ўчора, доступ ня прышлося спыніць да 10 гадзін. Да позьняй ночы праходзілі шматлікія чытачы і слухачы рэволюцыйнага поэты.

Сплаў лесу па-баявому неорганізаваны

Барысаўскі райком ЛКСМБ у гэтым напрамку злачынна бязьдзейнічае

(Па тэлеграфу ад нашага спэцыяльнага корэспондэнта)

Барысаў, 17. Плянавыя заданьні загатовак лесаматар'ялаў па 10 вучастках Барысаўскага аддзяленьня Лесбела на 10-га красавіка **нявыкананы.** Заданьне па загатоўцы будаўнічага лесаматар'ялу выканана толькі на 91,5 проц., па дрывах—на 79,6 проц.

Вывезена да прыстаняў будаўнічага лесаматар'ялу з колькасьці загатоўленага—69,6 проц. і дроў—51,6 проц. У лесе ўсё яшчэ застаецца ляжаць ня вывезеным будаўнічага матар'ялу—30,4 проц. і дроў—49 проц.

На вучастку прыступілі ўжо да вязкі плытоў. Зьвязана па ўсіх прыстанях 126.410 куб. мэтраў. У сплаў пушчана па рэчках каля 110.610 куб. мэтраў рознага лесаматар'ялу. З гэтай колькасьці 16.300 куб. мэтраў накіравана з Чарняўскага вучастку на Бабруйскі камбінат і ў Рэчыцу. У сплаў у першую чаргу пушчаецца будаўнічы—таўсты лес (экспортны і інш.).

Разам з тым на прыстанях па ўсіх вучастках **ляжыць бяз руху 412.677 куб. мэтраў** рознага сорту лесаматар'ялаў. Належным органам неабходна безадкладна прыняць самыя тэрміновыя захады да сплаву гэтых вялікіх залежаў таму, што лесу пагражае абсушка.

Вязка плытоў хаця і пачалася, але гэтая важная работа ідзе надзвычайна павольна. Сам сплаў па-баявому не організаваны.

У Барысаў прыбыла першая партыя плытоў (2600 куб. мэтраў) прызначаных для заводу „Комінтэрн". Ёсьць пагроза што з-за несвоечасовай дастаўкі лесаматар'ялаў некаторыя прадпрыемствы будуць мець перабой у працы. І гэта толькі таму, што сплаў лесу ідзе зусім марудным тэмпам.

Дрэнна абстаіць справа і з рабочай сілай. Для сплаву на сёньняшні дзень патрэбна 5 тысяч чалавек, а ёсьць усяго каля 300. На адным толькі Ухвальскім вучастку не хапае 200 чалавек рабочых.

Гэта тлумачыцца тым, што ўпаўнаважаныя па вярбоўцы рабочых працуюць вусім дрэнна. Гэтая справа чамусьці ня вельмі цікавіць лесбелаўскіх працаўнікоў.

На вярбоўцы рабочай сілы дрэнна адбіваецца і тое, што для сплаўшчыкаў не ўстаноўлены цьвёрдыя расцэнкі зарплаты.

Абураючым зьяўляецца той факт, што акруговы ўпаўнаважаны па ўкомплектаваньню рабочай сілы толькі сварыцца з Лесбелам і такім чынам сьвядома зрывае вярбоўку рабочых на сплаў. На гэты абураючы факт ніхто не зварачвае ўвагі, а між тым гэта зьяўляецца галоўнай перашкодай у вярбоўцы патрэбнай колькасьці сплаўшчыкаў.

Зусім недапушчальным зьяўляецца і тое, што харчаваньне сплаўшчыкам не організавана. Мясцовыя, коопэрацыйныя організацыі нічога не зрабілі для таго, каб даць патрэбную колькасьць харчаваньня тым рабочым, якія заняты на складзе.

Культурна-масавая работа на прыстанях адсутнічае. Зараз прыняты некаторыя захады для таго, каб наладзіць культурна-асьветную работу, але ў гэтым няма ніякай увязкі з адміністрацыяй рабачкому. Роля рабачкому на прыстанях, як кіраўніка рабочых, як організатара ўсіх мерапрыемстваў па абслугоўваньню апошніх не адчуваецца.

Надыходзіць вялікдзень, а на сёньняшні дзень яшчэ нічога ня зроблена ў сэнсе падрыхтоўкі да таго, каб у вялікодныя дні працаваць, больш таго, аддзяленьне Лесбелу і профорганізацыі маюць на ўвазе сьвяткаваць вялікдзень.

Райкомы КП(б)Б за выключэньнем Барысаўскага, не заслухоўвалі інформацыі аб ходзе сплаву. Імі нічога ня зроблена ў напрамку таго, каб па-баявому організаваць сплаў і зусім не дадзена ніякіх конкрэтных паказаньняў іншым грамадзкім організацыям наконт сплаву.

Райвыканкомы і сельсаветы таксама не пераключылі сваю ўвагу на баявую організацыю сплаву. Сельсаветы нічога не зрабілі ў напрамку таго, каб дапамагчы адпаведным організацыям у падборы рабочых для пасылкі іх па сплаў.

Недапушчальна абураючым фактам зьяўляецца тое, што комсамол у сувязі са сплавам абсалютна нічога ня робіць. Фактычна комсамольская організацыя ў гэтым напрамку бязьдзейнічае. Барысаўскі райком комсамолу ніякіх паказаньняў па ячэйкам не даваў і зусім нават не зацікаўлен пытаньнем сплаву. Райком на сёньняшні дзень ня ведае і таго, колькі комсамольцаў зараз працуе на сплаве.

Комсамольскія колектывы тых прадпрыемстваў, якія атрымоўваюць лесаматар'ял, як сыравіну ні разу ня ставілі на сваіх сходах пытаньня аб тым, каб лепш організаваць сплаў і гэтым самым забесьпечыць своечасовую дастаўку на прадпрыемствы лесаматар'яму. **Красуцкі.**

Рашучае выпраўленьне памылак--неабходная ўмова далейшага насту

Перабудаваць работу комсамольскіх ячэек у адпаведнасьці з задачамі колгаснага будаўніцтва, вядучы рашучаю бараць[бу] на два франты з правай, як галоўнай, небясьпекай і „левымі“ загібамі

...«Неабходна мобілізаваць усю энэргію і сродкі на пасьпяховае выкананьне ўстаноўленых партыяй і ўрадам плянаў пасеўкампаніі ў саўгасах. колгасах і індывідуальных-бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. Неабходна вясновую пасеўную кампанію зрабіць сапраўднай бальшавіцкай кампаніяй“.
(З рашэньняў сакавіковага пленуму ЦК КП(б)Б)

Прарывы на Самахвалаўшчыне

Самахвалавіцкі раён Менскай акругі мае значныя посьпехі ў галіне колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Аднак, побач з посьпехамі, маецца шэраг недахопаў, якія часта мяжуюцца з грубымі скажэньнямі дырэктыў партыі.

Работа з батрацтвам і бед натой адсутнічае

Організацыя батрацка-бядняцкіх груп пры сельсаветах, коопэрацыі на сёньнешні дзень не заняла належнага месца ў працы цэлага шэрагу партыйных і комсамольскіх організацый раёну.

Яшчэ да гэтага часу дырэктыва ЦК партыі аб стварэньні батрацка-бядняцкіх груп пры колгасах не знашла належнага праламленьня. Нізавыя органы ў сваёй практычнай дзейнасьці, рабоце сярод беднаты і батрацтва часта адводзяць апошняе месца. Напрыклад: міхавіцкая партыйная ячэйка, Кайкаўскага сельсавету, ня здолела організаваць батрацтва і беднату і на падставе гэтай апоры партыі на вёсцы замацаваць моцны саюз з серадняцкімі масамі. Дзякуючы бязьдзейнасьці партыйнай і комсамольскай ячэек шэраг організаваных колгасаў разваліўся. Напрыклад, у колгасе імя Сталіна сяляне падбухтораныя варожымі элемэнтамі, разагулілі плугі, бароны і іншы інвэнтар. Кулацтва, падкулачнікі вядуць шалёную агітацыю сярод бядняцка-серадняцкіх мас за разбурэньне існуючых колгасаў.

Гэтаму выступленьню клясавага ворага партыйная і комсамольская ячэйкі не даюць сваечасовага і належнага адпору. Сельсавет у гэтых адносінах злачынна бязьдзейнічае. Партыйная комсамольская організацыя, сельсавет і ўсе іншыя грамадзкія організацыі раёну сваечасова не растлумачылі бядняцка-серадняцкім масам артыкулу Сталіна і пастаноў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб барацьбе са скажэньнямі партыйнай лініі ў правядзеньні колектывізацыі.

Частка партыйных ячэяк ня здолела на хаду, па-бальшавіцку выправіць памылкі, перагібы і скажэньні, а яны пры організацыі колгасаў былі. Так, напрыклад, некаторыя прадстаўнікі шэфскай брыгады БДУ, праводзячы сходы, палохалі беднякоў і серадьякоў высяленьнем, калі яны ня пойдуць у колгасы.

Больш таго,—асобныя сельсаветы, не жадаючы весьці ўпартай працы з батрацтвам і беднатой, пашлі па шляху найменшага супраціўленьня, палохаючы серадьякоў індывідуальным абкладаньнем і раскулачваньнем. Былі выпадкі, калі дзякуючы ня чоткай політычнай лініі ў рабоце асобных сельсаветаў, не абкладаліся у індывідуальным парадку тыя, хто павінен быць абкладзен. Так Кальленьнік Кандрат, былы буйны спэкулянт, выкруціўся з-пад індывідуальнага абкладаньня і раскулачваньня. Карыстаючыся правам голасу, ён пралез у колгас і вядзе там разлагаючую працу.

Ураўнілаўка... на дапамогу кулаччу

Ячэйка супакоілася на тым, што правяла па вёсках сходы па організацыі колгасаў і выбрала праўленьне. Адсутнасьць-жа цьвёрдага партыйнага кіраўніцтва колгасамі прывяло да таго, што праўленьні колгасаў груба парушылі дырэктывы партыі і пастановы ўлады. Так, у колгасе імя Сталіна праўленьне вынесла пастанову, каб коняй раскулачаных гаспадарак аддаваць індывідуальным гаспадаркам.

Галавацяпы гэтага колгасу, на чале з старшынёю— Клюндзітам Ціхохам, на адным з паседжаньняў праўленьня ўхвалілі правесьці ўраўнілаўку сярод паасобных колгасаў. Даведаўшыся, што серадняк —Цялешка Бягун—корміць парсюка на сала, загадалі яму палову сала аддаць Дзікарэвіч Марылі. Кулаччо і падкулачнікі скарысталі гэты загад для развалу колгасу і дэзорганізацыі колгасьнікаў.

Былі пушчаны чуткі, што хутка ў серадьякоў адбяруць сала, куфры з палатном, вопратку і перададуць беднякам, што спрыяла разбазарваньню маемасьці колгасьнікаў.

Што робіць праўленьне— колгасьнікі ня ведаюць

Прашло амаль два месяцы, а колгасьнікі ня ведаюць аб дзейнасьці праўленьня. Ня ведаюць куды пашлі паявыя грошы. Кулаччо распаўсюджвае розную хлусьню пра колгас і яго кіраўніцтва, а колгасьнікі, ня ведаючы сапраўднага яго становішча, ня могуць даць хлусьні адпору. Сходаў з колгасьнікамі ні савет колгасу, ні партячэйка не праводзілі.

Такое становішча мае сваё месца і ў шэрагу інш ых сельсаветаў раёну. У Вужлянскім сельсавеце былі адкрытыя антысавецкія вытупленьні на сходзе. „Рыцар колектывізацыі“ Кастусь Барытонаў,—на сходзе колгасу імя Леніна сказаў: „Сёньня раскулачваем кулакоў, а заўтра серадьякоў“. Ня дзіўна, што гэты „колектывізатар“ пры раскулачваньні кулакоў набраў сабе масла, мёду, вопраткі, і нават карыстаўся доўгі час канём ад раскулачаных гаспадарак. І тут ячэйкі, сельсавет ня здолелі мобілізаваць батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы на барацьбу з гэтым антысавецкім антыпартыйным зьявішчам. Раскулачваньне праводзілася мясцовымі працаўнікамі бяз удзелу беднякоў і батракоў. Есьць выпадкі, калі беднякі і серадьякі спачуваюць паасобным раскулачаным кулакам.

Ведалі, а не рэагавалі

Слабое кіраўніцтва ячэек выявілася і ў час выбару праўленьняў колгасаў. У Вузьлянскім сельсавеце аграном, на адным з сходаў колгасьнікаў, выгнаў са сходу беднякоў і серадьякоў, якія яшчэ ня ўступілі ў колгас, а раённае кіраўніцтва на гэтыя трывожныя сыгналы не рэагавала. Члены бюро райкому партыі і комсамолу ведалі і ня прыдалі ўсяму гэтаму політычнага значэньня. Член бюро РК КП(б)Б тав. Філіповіч, ведаючы аб усіх перагібах ад серадьякоў у Кайкаўскім сельсавеце, не паставіў пытаньня на райкоме.

Дырэктывы партыі не даведзены да мас

Важнейшыя дырэктывы партыі аб неабходнасьці пашырэньня пасеўнай плошчы ў колгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках не даведзены да мас, не растлумачаны ільготы па сельска-гаспадарчым падатку, не праведзена ніякай працы па контрактацыі.

Скарыстоўваючы паасобныя перагібы, скрыўленьні клясавай лініі кулаччо і падкулачнікі падбухторваюць серадьякоў на скарачэньне плошчы пасеву, не атрымоўваючы рашучага адпору з боку мясцовага партыйна-комсамольскага і савецкага кіраўніцтва.

Самахвалавіцкай партыйнай організацыі з усіх гэтых фактаў скажэньня лініі ў раёне неабходна зрабіць адпаведныя бальшавіцкія вывады, каб павесьці далейшую барацьбу за колектывізацыю вёскі і ліквідацыю кулацтва, як клясы. Выпраўляючы прарывы, даючы бязьлітасны адпор панікёрскім настроям сярод паасобных членаў партыі, неабходна ўзмацніць барацьбу на два франты, як з правым опортунізмам, так і „левымі“ загібамі, сконцэнтраваўшы галоўную ўвагу на правым опортунізьме, як найбольш небясьпечным у даны момант.

АЛЕСЬ ВЯСЁЛЫ.

ЧАРНЯУСКІЯ „КОЛЕКТЫВІЗАТАРЫ“

(Азьдзяціцкі сельсавет, Барысаўскага р-ну)

— Галоўнае ў нас на сёньнешні дзень — колектывізацыя, адказвае кожны жыхар вёскі, ці як яе завуць тубыльцы,—м. Чарняўкі.

Галоўнае, то галоўнае, але як-жа гэтым „галоўным“ у Чарняўцы займаюцца.

Колектыў стварыўся яшчэ ўвосень міналага году.

Аб тым, што і як там робіцца, зараз раскажу. Калі гр-н Баркан Самуіл захацеў уступіць у колгас, яго больш паўгода ня прымалі.. Хто-ж такі Баркан,—кулак пазбаўленец, ці шкодны для колгаснага будаўніцтва элемэнт, і чаму яго не хацелі браць у колгас? На гэта лепш за ўсё адкажа дакумант, напісаны самім старшынёю колгасу —Каганам. Б. Вось пісулька, якую ён пісаў рабочаму брыгадзіру, што цікавіўся гэтым пытаньнем. (Падаю з захаваньнем мовы, стылю і ортографіі). „Отвечаю по вашей записке в следующем:

В 11-II у нас отбылося заседание совета (колгасу—АБ), где присутствовали 4 члена бюро партии постановили с Барканом воздержаться за такие прычины:

1. в том что он без работы у нас работы нет (?! А. Б.).

2. когда он на изживеньне сына пусть он живет с этого (сын гэты жыве ў Менску, мае сваю сям'ю і рэгулярна бацьку дапамаць ня можа—А. Б.).

3. и главное, что у нас идет расширение за счет сялянства и всё“.

Урэшце, агульны сход колгасьнікаў адмяніў гэту бязглуздую пастанову і прыняў Баркана С. у колгас.

Але праўленьне мае свой погляд на рэчы. Калі прадставілася праца па вартаваньню млыну, яе далі Нісьневічу М. арандатару садоў у м. Крушына, якога яшчэ адзін член сям'і працуе з канём і зарабляе на жыцьцё. „Бо ён прывёў у колгас каня і карову, а ты нічога ня маеш“—тлумачылі Баркану гэткую політыку „кіраўнікі“ колгасу.

Гэткая, яскрава опортуністычная політыка не пашкодзіла чарняўскім „колектывізатарам“ надзвычайна „лева“ загнуць пры абагуленьні жывёлы. У служачага Лесбелу—таварыша Падрабініка М. —жонка ляжала хворай. У іх-жа двое маленькіх дзяцей. Аднак, просьбы пакінуць адзіную карову пакуль кабета ачуняе былі рашуча адкінуты.

Відаць для Чарняўкі ніякія законы ня пісаны. Вось што піша нам адзін знаёмы—сябра прафсаюзу— ужо 17-га сакавіка: „Сёньня адбыўся саюзны сход. Канкрэтна было пастаўлена пытаньне, хто ня пойдзе ў колгас, таго зьнімуць з працы і выключаць з саюзу. І далей у нас ужо абагулены каровы і коні. Наконт кароў шмат спрэчак. У газэце было, што адна карова ў гаспадарцы не абагульваецца, але мы думаем, што гэта ў вёсцы, а ня ў нас!!! Што-ж робіць сельсавет? Ды нічога. У самым цэнтры сельсавету з 250—300 двароў уцягнута ў колгас толькі двароў 50—60 (гэта—ва ўдарным Барысаўскім раёне суцэльнай колектывізацыі).

Хто-ж увашоў у колгас і якім шляхам?

Апрача некалькіх перадавых беднякоў увашлі выключна заможнікі, якім інакш пагражала раскулачваньне. Асноўная бядняцка-серадняцкая маса так і застаецца па-за колгасам.

Паўстае пытаньне—куды мы заедзем з гэткай калектывізацыяй?

Барысаўскі РВК і райком КП(б)Б, шэфы—рабочыя заводу „Комінтэрн“ павінны зьвярнуць на гэты „колгас“ сваю ўвагу. А. БАРКАН.

Рост колгасаў за лік батрацтва, беднаты і серадняцтва

Праведзена шырока-растлумачальная праца артыкулу Сталіна: „Адказы таварышом колгасьнікам“ і пастаноў партыі аб ільготах колгасьнікам у колгасах Дукорскага сельсавету: «16-партызан“, „Чырвоны Паршызан“, „Праца“.

Наглядаецца вялікі прылiў у колгасы індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Фрыд.

Правалы ў ячэйцы

Комсамольская ячэйка Лагойску побач з некаторымі дасягненьнямі ў практычнай працы па колектывізацыі (актыўны ўдзел у організацыі колгасаў і ў замацаваньні іх, абагуленьні насеньня, удзел у ачыстцы яго, абагульваньне і рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару, збор попелу і сродкаў у фонд колектывізацыі), дапусьціла праваапартуністычную памылку, якая выразілася ў недаацэнцы работы сярод батрацтва і беднаты.

У ячэйцы адсутнічала праца па організацыі культурна-масавага абслугоўваньня колгасьнікаў, растлумачэньня статуту арцелі і правіл унутранога распарадку ў колгасах, а як вынік гэтага калгасьнікі ў час выступленьня старшыні РВК аб паднясьці працдысцыпліны, заявілі: „нам дысцыпліна не па[трэб]на“.

Адсутнічаньне дысцыпліны с[ярод] колгасьнікаў месцамі мяжуец[ца са] шкодніцтвам. На організаванай [ма]шынна-коннай станцыі няма н[іяка]га парадку, коняй не шкад[уюць,] кормяць аўсом з пяском, шмат [ко]няй захварэла і ня змогуць в[ыйсьці] на працу. Езьдзіўшыя колгас[нікі] на конях глядзяць на іх не я[к на] сваіх, і не дагледаюць. Комса[моль]ская-ж ячэйка ня прымае н[іякіх] захадаў барацьбы за працо[вую] дысцыпліну.

Неадкладная задача ячэйкі [уз]мацніць працу па організацы[і] ... ў когасах, барацьбу за пр[ацоў]ную дысцыпліну і г. д.

Э. Раскін

Комсамольцы дапамагаюць колгас[ам]

Жыткавіцкім райкомам комсамолу організаваны [тры] брыгады (кавалі, шаўцы і краўцы) з комсамольцаў і партыйнай моладзі для практычнай дапамогі колгасам.

Брыгады за час свайго выхаду ў колгас зрабілі шм[ат] працы: група кавалёў адкавала 10 колаў і 7 плугоў. Гр[упа] шаўцоў адрамантавала 50 пар ботаў, а краўцы пашы[лі] дзьве новыя спэцвопраткі, 6 сьвітак, 8 пар сарочак, 12 [пар] штаноў і пашылі 12 шапак. Адначасова брыгады раман[та]валі інвэнтар індывідуальных бядняцкіх гаспадарак.

КУЦАНУ.

Лядніцкія комсамольцы ў „падрыхтоўцы“ да вясеньняй сяўбы

Сустрэнем вясну падрыхтаванымі

Колгас імя „Комсамольскай Праўды“, з дня сваёй організацыі зараз шчыльна падышоў да правядзеньня вясеньняй п сеўнай кампаніі, зрабіўшы абагуленьне рабочай жывёлы, інвэнтара і насеньня.

Насеньне ў колгасе ачышчана і поўнасьцю ссыпана. Інвэнтар зараз падрыхтоўваецца, рамантуецца, здабываецца новы.

Зараз выдзелены брыгады па выкананьню тых ці іншых галін работы пры пачатку саўбы. Праўленьне колгасу сумесна з комсамольскай ячэйкай вядуць адпаведную работу, каб організавана выступіць у поле.

Вясною распачнецца працяг работы па мэліарацыі ў калгасе.

Яравы клін ужо вызначан для засеву. Праведзена контрактаваньне прадуктаў колгасу: малака, жыта і інш.

Усе колгасьнікі актыўна ўдзельнічаюць у рабоце колгасу.

Я. З.

Профшкольцы ў колгасах

Комсамольская ячэй[ка] Слуцкай профшколы ўз[я]ла шэфства над Пр... шчыцкім і Казловіцк[ім] сельсаветам, організава[ў]шы дзьве брыгады па к[о]лектывізацыі з 10 чал[а]век і 1 брыгада па [ра]монту сельска-гаспада[р]чага інвэнтару у кол[га]сах з 20 чалавек. Бры[га]да працавала на прац[ы] 7 дзён у Ісэрскім сель[са]веце, адрамантаваў[шы] 36 плугоў і шмат др[об]ных рэчаў (балты, к... і г. д.).

Профшколец.

З поўнай гатоўнасьцю вышлі ў по е

Колгасьнікі вёскі Брынёва, Петрыкаўскага раёну ў поўнай гатоўнасьці да вясеньняй сяўбы. Сродкі вытворчасьці абагулены і адрамантаваны, абагуленае насеньне поўнасьцю ачышчана. Колгас землеўпарадкаваны, разьбіў поле для асобных відаў культур і ўжо пачаў сыстэматычную працу па ворыву.

У падрыхтоўцы колгасу [да вя]сеньняй сяўбы комсамольская [ячэй]ка прымала актыўны ўдзе[л. На] сваіх сходах абгаварвала пы[таньні] правядзеньня асобных мера[прыем]стваў у гаспадарцы, актыўна [ўдзель]нічаючы ў іх выкананьні.

Глозман Не[ў]іка

У барацьбе за прамфінплян

Гаворыць юнкораўская брыгада

ГОМЕЛЬСКАЙ МЭБЛЁВАЙ ФАБРЫКІ:

...БЛЁВАЯ ФАБРЫКА ДРЭВААПРАЦОВАЧНАГА КАМБІНАТУ ПРАЦУЕ З ВЯЛІКІМІ СТРАТАМІ І ПЕРАБОЯМІ. ФАБРЫЧНАЯ НАСЬЦЕНГАЗЭТА БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ. ЛЕСАМАТАР'ЯЛ НЕ АДПАВЯДАЕ ПРЫЗНАЧЭНЬНЮ І ДРЭННА ПРАСУШВАЕЦЦА. ПРАМФІНПЛЯН ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

Накіруем работу юнкораўскіх брыгад на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну

Віт. Сідарук

... Ізноў „об'ектыўныя"...

...а Гомельскай мэблёвай фабры... Дрэваапрацовачнага камбінату ...ьшая частка рабочых ня ведае ...існаваньні прамфінпляну. Пы...ньне аб выкананьні прамфінпля... і прычынах яго няпоўнага вы...наньня не абгаварвалася ні ў ...ным цэху. Па пляну ўся работа ...брыкі павінна складацца з 9 ас...ўных процэсаў, але для праў...ньня працколектыву ніякія пля...ня існуюць і яно навапіла на ...бр...ку больш двух дзесяткаў ...зных дробных работ, якія тар...зяць пасьпяховае выкананьне ...оўных работ прадпрыемства.

...абрыка знаходзіцца зараз у ...ытычным становішчы. Прыбыва...ыя на фабрыку матар'ялы часта ...ечасова не выгружаюцца. Зар...та рабочым выдаецца з вялікімі ...зьненьнямі. Фабрыка працуе бяс...інава, няма дагаворанасьці ся... адміністрацыі, брыгадзіраў і ...страў, дзякуючы чаму іх роля ...ыцьці і працы фабрыкі значна ...яншаецца і дрэнна адбіваецца ...рабоце нават усяе фабрыкі. Па...ле вытворчай програмы, за два ...яцы другога кварталу сталяр... цэх павінен быў выпрацаваць ...альховых і дубовых буфэтаў, ...выпрацаваў толькі 4, што скла... недавыкананьне заданьня на ... проц., па шафах програма вы...ана на 49,1 проц., па камодах ...авыканана на 94,5 проц.

...абясьпечаньне абойнага цэху ...камі, замкамі цыратай і спру...намі пастаўлена вельмі дрэнна ...раз ужо стаіць пытаньне аб ...ыненьні цэху. Па абойнаму цэ... програма выканана на 40.7 пр. ...гулы на фабрыцы прымаюць ...ражаючыя памеры. За адзін ...кі студзень месяц прагулы ...лаюць 1908 чалавекагадзін.

...аказальнікаў па сабекошту про...цы і вытворчасьці працы яшчэ ...а. Сводкі даюцца з вялікім ...зьненьнем і, у дадатак, вельмі ...таныя.

...эзадказнасьць і безгаспадарнасьць расквітаюць

...айстры цэхаў не адчуваюць ні... адказнасьці за сваю работу, ... праяўляюць ніякай самастой...ьці. Вельмі часта высока-кваліф...аваныя рабочыя перакідаюцца ...орную, нізкааплачваемую ра...у, што таксама ўздаражае сабекошт. Шмат часу траціцца рабочымі ў пошуках работы. У сталярна-зборачным цэху цесната. На двары пад паветцю навалены вырабы, сярод якіх ня мала браку. Памяшканьне таксама завалена гатовай продукцыяй. Пад адкрытым небам валяецца шмат годных абрэзкаў, якія псуюцца пад дажджом. Вучоту матар'ялу няма. Склад цалкам загружаны гатовай продукцыяй, якая ад вільгацыі псуецца. Ёсьць прастоі па прычыне недахопу клею.

Нядаўна на фабрыцы было зроблена 50 шафаў і толькі, калі прышлося ўстаўляць філёнгі, схапіліся, што іх няма. Да пыльных сьценак шафаў замест фанэры другога сорту ўжываюць фанэру 3-га і 4-га сорту. Філёнгі фаняруюцца дрэнна. Фанэра адстае, адчаго сабралося шмат браку. Няма ніякай плянавасьці ў пастаноўцы ўсёй працы па цэхах.

Рабочая ініцыятыва заціраецца

У вытворчае жыцьцё фабрыкі рабочыя ня ўцягнуты. Адміністрацыя ня лічыцца з рабочымі і ўсё робіць габінэтным парадкам. Выпрацаваны адміністрацыяй проэкт новай растаноўкі процэсаў на вытворчай камісіі не абгаварваўся. Гэты проэкт без усялякай падрыхтоўкі выносіцца на пашыраную вытворчую нараду, дзе і зацьвярджаецца наскокам.

Шмат каштоўных прапаноў марынуецца. Напрыклад, рабочыя казалі, што трэба рабіць філёнгі, але адміністрацыя нядбайна аднеслася да гэтай прапановы і ў выніку прастоі.

Спаборнічаюць на паперы

Ніводзін пункт гаспадарча-палітычнага дагавору ня выкананы. Плянавасьці ў рабоце няма. Назіраюцца прагулы і спазьненьні. З агульнай колькасьці рабочых фабрыкі ў 225 чалавек, соцспаборніцтвам формальна ахоплена толькі 50 проц. Ёсьць некалькі вытворча-бытавых комун, але кіраўніцтва імі ніякага. Фабком не зьвяртае ўвагі на выкананьне прамфінпляну і соцспаборніцтва. Партыйная і комсамольская ячэйкі фабрыкі амаль ня цікавяцца становішчам прадпрыемства.

Фуганок

Газэта бязьдзейнічае

Насьценная газэта Гомельскай мэблёвай фабрыкі імя „10-годзьдзя БССР „Чырвоны Дрэваапрацоўшчык" дрэнна адлюстроўвае жыцьцё і недахопы вытворчасьці, не змагаецца належным чынам за зьнішчэньне хібаў вытворчасьці: прагулаў, браку, безгаспадарчасьці і інш., а ў большасьці займаецца дробнымі справамі. Да голасу насьценкораў заводзкія організацыі амаль не прыслухоўваюцца. Усю віну за зрыў работы насьценгазэты бясспрэчна павінна несьці рэдколегія, якая не змагла організаваць вакол газэты рабочую масу. Былі выпадкі, калі зусім няўважліва адносіліся да допісаў. Напрыклад: нядаўна насьценкор напісаў допіс аб выпадках безгаспадарнасьці ў сталярным цэху, дзе падаюць рабочы паўфабрыкат неаднолькавога памеру і гэты паўфабрыкат ужываецца рабочымі, у выніку чаго работа ў большасьці бракуецца і накідаецца пасьля таго, як на яе затрачана шмат каштоўнага рабочага часу. Калі-ж паказваюць брыгадзіру на такія ненармальныя зьявы, то ён адказвае:

— „Перарабі. Табе за гэта заплоцяць".

Трэба тэрмінова аднавіць рэдколегію і вывесьці з яе складу тых, хто сваім бюрократычным дзеяньнем затрымлівае зьнішчэньне маючыхся недахопаў.

Адзіным поступам юнкораўскіх брыгад саб'ём шкоднікаў, зрываючых выкананьне прамфінпляну.

Г. Буслоўскі

Прастоі, брак і... зноў прастоі

Гаспадарнікі мэблёвай фабрыкі (Гомель) ня цікавяцца запасам паўфабрыкатаў, якія маюцца на фабрыцы, а гэта прыводзіць да частых простояў і перапынкаў у рабоце. Такія адносіны да забясьпечаньня фабрыкі паўфабрыкатамі тармозяць плянавы выпуск прадукцыі, чым зрываюць пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Прывядзем адзін з шматлікіх фактаў: 30 сакавіка не аказалася вялікіх скрынь для шафаў, вынікам чаго быў прастой рабочых дзьвюх зьмен. Такое ненармальнае становішча існуе на фабрыцы і па сёньняшні дзень. Адсутнасьць паўфабрыкатаў адміністрацыя тлумачыць тым, што матар'ял сыры, і што ён зараз сушыцца.

Мы пытаемся: а дзе-ж вы былі раней, шаноўныя галавацяпы? Ці-ж вы праз чорныя акуляры ня бачылі пагражаючага становішча?

Брускі для дзьверак шафаў робяцца з гнілога матар'ялу. Нядаўна была зроблена цэлая партыя такіх дзьверак; яна прашла ўжо праз усе варштаты, апрацавалася і... пасьля ўсяе работы дзьверкі былі забракаваны. Рабочыя лічаць, што такія адносіны гаспадарнікаў да сваіх абавязкаў недапушчальны

Рыгор

Соцспаборніцтва як і ня было

Соцспаборніцтва ў сталярна-зборачным цэху мэблёвай фабрыкі адсутнічае, ня гледзячы на тое, што асноўная маса рабочых фабрыкі ў першы пэрыод разгортваньня соцспаборніцтва энэргічна ўзялася за зьнішчэньне ўсіх маючыхся хібаў. Кіраўніцтва з боку фабкому і заводакіраўніцтва ніякага ня было. Нават адміністрацыя часамі сама зрывае спаборніцтва, ня выконваючы патрабаваньняў і прапаноў рабочых. Плянавасьці у рабоце няма. Брыгадзіры ня ведаюць, якая работа павінна быць выканана ў першую чаргу, якая работа будзе заўтра і што даць кожнаму рабочаму паасобку.

Працдысцыпліна кульгае. Чарнарабочыя не нагружаны работай. Нярэдкі выпадкі, калі яны ў курыльным пакоі праседжваюць шмат часу. Рабочым прыходзіцца замест сваёй асноснай работы загатаўляць сабе матар'ял. Рабочы дзень ушчыльняецца на паперы ўжо некалькі месяцаў. Прыходзячы на работу, рабочы прыступае да працы толькі пасьля паўгадзіны дзякуючы таму, што трэба шукаць сабе матар'ял і ачышчаць месца для працы, бо непатрэбны матар'ял і розныя кавалкі валяюцца ў цэху. Усе праходы завалены, нават прайсьці цяжка.

Аб выкананьні прамфінпляну рабочыя не ведаюць. Ня ведаюць таксама і аб прычынах прарываў у сваім цэху.

Галкель

Сушылка кульгае...

Сушка матар'ялу на Гомельскай мэблёвай фабрыцы вытвараецца зусім дрэнна. Матар'ял у сушку навальваюць, як пападае, а не складаюць, што адбіваецца на якасьці продукцыі. З сушылкі матар'ял выходзіць пакароджаным і крывым, а часамі патрэсканым. Атрымоўваецца гэта дзякуючы нядбайным адносінам рабочых сушылкі, якія не даглядаюць за правільным ходам яе загрузкі. 20 сакавіка з сушылкі быў атрыман зусім крывы і патрэсканы сасновы і дубовы матар'ял і вялікая частка яго была забракавана

...і хібах у рабоце шматтыражак*)

(...спрэчак па дакладу т.т. Курціка і Васкабойнікава)

...мацніць сувязь газэт з рабкорамі

Тав. Якаўлеў. Шматтыражкі ...сьценгазэты зьяўляюцца тымі ...ньнямі, на якія абапіраюцца ў ...й рабоце нашы цэнтральныя ...ты. Яны зьяўляюцца асноўнымі ...ньнямі, без якіх не маглі-б існа...ь нашы газэты. Першая ўсебела...кая нарада мае вельмі вялікае ...аньне. Праз гэту нараду мы ...інны ўзмацніць існуючую сувязь ...й вялізарнай арміяй рабкораў, ...ю мы маем на беларускіх прад...емствах. Нажаль, у нас да гэ... часу шчыльнай сувязі з раб...амі няма. Гэта зьяўляецца вялі... нашым недахопам.

...чым асноўная задача сучасна... момэнту, якая стаіць перад прад...емствам? Яна заключаецца ў ..., каб мабілізаваць масы на ба...ьбу за поўнае выкананьне і пе...ыкананьне прамфінпляну. Тут ...і з таварышоў спыняўся на ..., што нашы шматтыражкі і ...сьценгазэты нібы зьяўляюцца апо...ічнымі. Яны не апалітычны, ... недастакова асьвятляюць пы...таньні сучаснага дня, не заўсёды ...разумеюць тое, што яны павінны ...асьвятляць на сваіх старонках.

*) Даклад т. Курціка і т. Васка...бойнікава будзе зьмешчан заўтра.

Больш конкрэтызаваць асьвятленьне

Тав. Леўтаў. Партыя праводзіла і праводзіць барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць беларускага нацыянал-дэмократызму. Ці знайшла гэтая барацьба водгукі на старонках шматтыражак і насьценгазэт? На вялікі жаль, у многіх гэтага няма.

Барацьба за прамфінплян ёсьць неадымная частка генэральнай лініі партыі. У гэтай барацьбе мы ўжываем ленінскі мэтад, які стаіць у аснове політыкі комуністычнай партыі. Гэта мэтад соцыялістычнага спаборніцтва, мэтад самакрытыкі. Як у нас стаіць пытаньне аб соцспаборніцтве? Трэба прызнацца, што мы не заўсёды чотка ставім гэта пытаньне, недастаткова б'ем па конкрэтных носьбітах зла, не выкрываем лжэ-ўдарнікаў, не паказваем тых, хто зрывае яго. Мы займаемся крытыкай, а самакрытыкай мы не заўсёды займаемся.

Мы часта паказваем дрэнных працаўнікоў і не выстаўляем поруч добрых, не паказваем поруч з дрэнным цэхам, лепшы цэх, брыгаду, прадпрыемства. Многа шматтыражак зьяўляюцца аднабокімі, паказваюць усё дрэннае, а добрага ў іх быццам няма. Між тым, наша задача—ганьбячы дрэннае, паказваць добрае, вучыць на прыкладах.

Узмацніць тэхнічнае кіраўніцтва

Тав. Кошкін. Я павінен адразу-ж спыніцца на крытыцы і самакрытыцы па дакладу тав. Васкабойнікава. ВСНГ недастаткова аддаваў увагі кіраўніцтву заводамі трэсту і г. д. У свой час газэты білі трывогу аб невыкананьні Лесбелам пляну па лесазагатоўках, а ў гэты час ВСНГ займаўся міжведамственнымі нарадамі.

У нас, у вагонных майстэрнях, работа з насьценгазэтамі зусім не скранулася з месца.

Тав. Чарнякоў. ВСНГ і трэсты недастаткова кіруюць прамысловасьцю, чым утвараюць „об'ектыўныя ўмовы". Прыкладам гэтага можа служыць завод імя Ланцуцкага (былыя галоўныя Гомельскія чыгуначныя майстэрні). Прапануецца пашырэньне гэтага заводу з павялічэньнем ліку рабочых да 4 з пал. тысяч чалавек.

Першага кастрычніка яго павінны былі перадаць Белмэталятрэсту; апошні толькі гэтымі днямі прыехаў і распачаў абсьледваньне заводу. Прамфінплян на гэтым заводзе складаўся 4 разы і толькі гэтымі днямі быў складзены апошні варыянт пляну. Раней меркаваўся выпуск нейкіх капроў, а потым выявілася, што гэта ня пойдзе. Зараз завод павінен быў вытварыць запасныя часткі для трактароў. Зараз аказалася, што трэба зрабіць пераабсталяваньне з затратай ад 400 да 500 тысяч руб., ад чаго адміністрацыя заводу адмовілася.

Трэба больш зьвярнуць увагі на кіраўніцтва рабкорамі.

Стала ажыцьцяўляць парткіраўніцтва шматтыражкамі

Тав. Гонікман. На нашых прадпрыемствах кіраўніцтва з боку партыйных організацый газэтамі амаль адсутнічала і таму наша газэта мела шмат памылак.

Патрэбна больш аддаць увагі кіраўніцтву газэтамі, гэта па-першае, а па-другое неабходна больш зьвярнуць увагі на падбор рэдкалегій.

Мы стаім перад ваеннай небясьпекай і таму наш друк ня можа стаяць у баку ад гэтага пытаньня.

Увага вылучэньню рабкораў

Тав. Брайнін. Газэта не павінна цягнуцца ў хвасьце, яна павінна быць да таго гібкай, каб своечасова прыкмячаць і рэагаваць на кожны прарыў на вытворчасьці, асабліва па выкананьні прамфінпляну.

У Віцебску было вельмі многа памылак, там дрэнна пастаўлена кіраўніцтва рабсялькораўскім рухам. Выклік у Менск для інструктаваньня работнікаў шматтыражак, як гэта пачынае рабіць „Зьвязда", дасьць вялікую карысьць нашай рабоце.

Пытаньне аб вылучэньні работнікаў на газэтную работу павінна стаяць у парадку дня. Мы маем вельмі каштоўных рабкораў; зусім іх не вылучаем.

Не адставаць ад падзеяў

Тав. Зэльман. Газэты-шматтыражкі не заўсёды своечасова рэагуюць на праявы правага ўхілу. Часта наша газэта на прадпрыемстве пачынае крычаць аб тых рэчах, якія адбываюцца ў яе пад бокам, тады, калі аб гэтым зашумелі цэнтральныя газэты; часта займаюцца фіксаваньнем фактаў і не паказваюць свой уласны твар.

Нашы рабкоры ноччу зрабілі налёт на гомельскі завод „Пролетары", дзе знайшлі, што 33 варштаты стаяць без работы. Калі напярэдадні налёту запыталіся ў кіраўніка прадпрыемства ці ёсьць на прадпрыемстве прастоі прагулы, дык ён упэўніў, што іх няма і ня было ніколі.

Ніводнага рабкора няўдарніка

Тав. Дворсан. Мы гаворым, што рабкор ёсьць перадавы рабочы. Ці ўсе нашы рабкоры зьяўляюцца ўдарнікамі? Трэба сказаць, што ня ўсе нашы рабкоры сталі ў шэрагах ударнікаў.

Нашы фабрычна-заводзкія газэты недастаткова маюць сувязь з насьценгазэтамі вёскі, з газэтамі саўгасаў, колгасаў. Гэты недахоп трэба будзе зьнішчыць.

ВЯРБОЎКА Ў ВАЙСКОВЫЯ ШКОЛЫ ІДЗЕ ПАВОЛЬНЫМІ ТЭМПАМІ

Дабіцца рашучага пералому ў справе вярбоўкі рабочай, батрацкай і бедняцкай моладзі ў вайсковыя школы—неадкладная задача комсамольскіх арганізацый

Недапушчальная маруднасьць—небясьпека зрыву вярбоўкі

Па Віцебскай і Полацкай акругах работа па вярбоўцы ў вайсковыя школы праходзіць вельмі марудна. Толькі ў красавіку месяцы пачынаюць афармляцца вярбовачныя камісіі. Шырокая растлумачальная работа аб задачах і патрабаваньнях, якія ставяцца ў гэтым годзе ў справе вярбоўкі ў вайсковыя школы, яшчэ не пачалася. Праверка выкананьня дырэктыў, якія дадзены вярбовачнай камісіі па лініі савецкіх, профэсыянальных і комсамольскіх арганізацый, не праводзіцца. Газэты „Віцебскі Пролетары" і „Чырвоная Полаччына" ў гэтай кампаніі ўдзельнічаюць недапушчальна слаба.

Па Віцебскай акрузе вярбовачная камісія яшчэ ня складзена. Уся работа па вярбоўцы ў вайсковыя школы даручана аднаму чалавеку—акруговаму ваеннаму камісару. Паказаньні цэнтральнай вярбовачнай камісіі аб задачах вярбоўкі ў вайсковыя школы Віцебскі акруговы выканаўчы камітэт атрымаў 13 сакавіка, а пастанова прэзыдыуму Віцебскага АВК аб арганізацыі вярбовачнай камісіі вынесена толькі 22 сакавіка. Правілы і праграмы для паступаючых у вайсковыя школы разаслалі толькі 4 красавіка, наогул уся арганізацыйная і растлумачальная работа павінны былі скончыцца да красавіка.

Віцебскае акрпрофбюро аднеслася да гэтай кампаніі павярхоўна. На нарадзе фабзавмясцкомаў пытаньне аб удзеле профсаюзных арганізацый па вярбоўцы ў вайсковыя школы было пастаўлена ў агульнай форме,—без паказаньня тых конкрэтных задач, якія пастаўлены ў справе вярбоўкі ў вайсковыя школы. Абмежаваліся пустою алілуйскай пастановай „прапанаваць фабзавмясцкомам разгарнуць працу вакол вярбоўкі ў вайсковыя школы. За ўсімі даведкамі, якія датычацца прыёму ў школы і аб умовах паступленьня ў апошнія, зьвяртацца ў ТСА-Авіяхіму і Акрана. На гэтым паставілі кропку. Ніякай растлумачальнай работы не вялося. Культаддзел Віцебскага Акрпрофбюро даў фабзавмясцкомам кароценькія пісьмовыя паказаньні аб удзеле іх у вярбоўцы.—„Для лепшага адбору кандыдатур у вайсковыя школы фабзавмясцкомы прадпрыемстваў, у якіх налічваецца 500 і больш рабочых, арганізаваць пры фабзавмясцкоме вярбовачную камісію з 5-ці асоб з забясьпечаньнем прадстаўніцтва ад усіх заводзкіх арганізацый". У якія школы ідзе вярбоўка, што зрабіць з тымі, якія дадуць згоду паступіць у вайсковыя школы, фабзавмясцкомы ня ведаюць. На фабрыках Мэтпром і абутковай імя „Лекерта" фабзавмясцкомы ашчэ ня ведаюць ні правіл прыёму ў вайсковыя школы, ні таго, нават у якія школы ідзе набор.

Акругком комсамолу ніякіх паказаньняў райкомам КСМ аб удзеле комсамольскіх арганізацый у гэтай важнейшай палітычнай кампаніі не даваў. Дзякуючы гэтаму, комсамольскія ячэйкі нічога ня робяць па вярбоўцы лепшых комсамольцаў — ударнікаў з вытворчасьці ў вайсковыя школы. У газэце „Віцебскі Пролетары" абмежаваліся толькі зьмяшчэньнем кароценькай абвесткі аб тым, што пачынаецца прыём у вайсковыя школы з паказаньнем, які трэба мець узрост для паступленьня ў вайсковыя школы, а таксама, што будуць арганізаваны курсы для падрыхтоўкі.

Па Полацкай акрузе вярбовачная камісія ўтворана толькі 27 красавіка. Ніводнага паседжаньня камісіі не адбылося. Правілы прыёму вайсковыя школы ляжалі ў шафе не разасланымі. Акругком комсамолу даў паказаньне райкомам комсамолу аб удзеле ячэек ЛКСМБ у вярбоўцы, але не правяраў як выконваюцца гэтыя паказаньні. Прадстаўнік ад комсамолу акруговай вярбовачнай камісіі ня ведае ў якія школы ідзе вярбоўка, ня гледзячы на тое, што ён працуе ў АВК.

Акруговы савет ТСА - Авіахэму таксама нічога ня робіць, ніякіх указаньняў ТСА-Авіахэмаўскім арганізацыям аб задачах удзелу ў вярбоўцы ня дадзена. Газэта Чырвоная Полаччына" у гэтай кампаніі абмежавалася адным артыкулам агульнага зьместу.

Усе вышэй пералічаныя факты яскрава сьведчаць нам аб тым, што кампанія па вярбоўцы ў вайсковыя школы праходзіць маруднымі тэмпамі. Грамадзкая думка навакол гэтага важнейшага палітычнага пытаньня ня складзена. Задачы і ўмовы вярбоўкі ў вайсковыя школы ў гэтым годзе не популярызаваны. Неабходна заразжа з больш хуткімі тэмпамі, з большай арганізаванасьцю ў рабоце комсамольскіх, партыйных і савецкіх арганізацый прыступіць да правядзеньня вярбовачнай кампаніі, інакш гэтай важнейшай кампаніі пагражае зрыў. Неабходна прыцягнуць да адказнасьці тыя арганізацыі і ўстановы, якія пасыўна і павольна адносяцца да важнай кампаніі ўкомплектаваньня рабочымі батрацка-бядняцкімі кадрамі вайсковых школ.

М. ЯКУБОВІЧ.



Комсамольцы заводу „Комунар" на практычных вайсковых занятках

Вось як яны рыхтуюць кадры

У вёсцы **Русакі**, Грэскага раёну маецца гурток ТСА-Авіахіму. Запісалася ў яго амаль уся русакоўская моладзь колькасьцю 56 чалавек. Комсамольская ячэйка вылучыла кіраўніком гуртка комсамольца Дарашэвіча, які нядаўна дэмобілізаваўся.

Моладзь вельмі захапілася вайсковай працай, але, на вялікі жаль, пачынаючы з лістапада месяцу, ніякіх занятках вайсковага гуртка не праводзіцца. Бюро ячэйкі не зварочвае на гэта аніякай ўвагі. Комсамольцы і беспартыйная моладзь вышлі з гэтага гуртка.

Пытаем—ці такой работай русакоўскія кіраўнікі падрыхтуюць кадры для вайсковых школ.

Паваротны.

Вярбоўкі ў вайсковыя школы ніколі не абгаварвалі

У вёсцы **Мацкевічы** маецца ячэйка ТСА-Авіахіму, якая налічвае ў сваіх шэрагах каля 23 чал. Але, на вялікі жаль, ніякай работы па ваенізацыі насельніцтва не праводзіцца, пераменьнікаў у работу не ўцягнулі, ніколі не абгаварвалася пытаньне аб вярбоцы ў вайсковыя школы. Сельсавет і комсамольская ячэйка зусім ня цікавіцца работаю ТДА-Авіахіму.

Гаротны.

Дзень у АБВШ

Шэсьць гадзін... Ціха ў мураваных сьценах АБВШ. Быццам усё вымерла. Гадзіная стрэлка рухаецца ўперад... Адбіла сем. Сыгналісты грае пад'ём, парушана цішыня, вясёлы сьмех, гоман. Роўна праз 10 хвілін стройна выходзяць маладыя курсанты на фізкультуру. Ногі выбіваюць роўны рытмічны тахт: раз, два, тры, раз, два, тры.

Затым умываньне і гарбата.

Зноў раздаецца сыгнал... Водгук днявальных: „Выходзь на занятκі!" Падручнікі і сшыткі пад пахаю, курсанты накіроўваюцца ў вучэбную частку. А там знаёмыя пакоі.., Габінэт тактыкі, топаграфіі, белмовы, адміністрацыі, політработы, экономполітыкі і г. д. і г. д. Так працуюць да 12 гадзін. А 12—сьнеданьне, а потым—у поле на практычныя заняткі. Гадзіны бягуць няпрыкметна. Вось падышла чацьвертая, канчаецца працоўны раскладны дзень, ідзем на абед. Пасьля абеду мёртвая гадзіна,—адпраўляюцца на паўтарагадзінны адпачынак. Зноў змаўкае школа на кароткі тэрмін. Курсанты пасьля адпачынку накіроўваюцца ў вучэбны аддзел для замацаваньня сваіх ведаў. Некаторыя гуляюць у шахматы і іншыя гульні, некаторыя займаюцца фізкультурай.

10 гадзіна вечару,—вячэрняя гарбата, а потым пагулянка і адбой.

Зноў змаўкае школа, каб заўтра з новымі сіламі ўзяцца за вучобу.

Алёшка Янка.

Матар'ялы „Чырвонай Зьмены" пацьвердз[ілі]

Пастанова ячэйкі КП(б)Б Музтэхнікуму па арты[кулу] „Антырэлігійнае хуліганства"

Заслухаўшы і праверыўшы зьмест артыкулу „Антырэлігійнае хуліганства" („Чырвоная Зьмена" ад 15-IУ) Бюро яч. КП(б)Б Музтэхнікуму канстатуе, што пададзеныя ў газэце факты аб пастаноўцы адрыўку з опэры „Барыс Гадуноў" (Карчма), якая была пастаўлена яч. саюзу Ваяўнічых Бязбожнікаў Музтэхнікуму—пацьвердзіліся.

Прыцягнуць да адказнасьці мастацкіх кіраўнікоў гэтай пастаноўкі за недастатковае і дрэннае мастацкае афармленьне.

Бюро яч. ЛКСМ Тэхнікуму прыцягнуць да комсамольскай адказнасьці комсамольцаў—сяброў Бюро яч. Бязбожнікаў, якія нядбайна аднесьліся да пастаноўкі.

Адначасова з гэтым адзначыць, што за апошні час на эстрадах клюбаў выступаюць непадрыхтаваныя студэнты і з дрэнным рэпэртуарам. Даручыць т. Казакову (дырэктару Тэхнікуму) катэгарычна забараніць выступленьні студэнтаў Тэхнікуму, як індывідуальна, так і групамі па ўсіх клясах і відах музычнага мастацтва без праверкі іх падрыхтоўкі і іх рэпэртуару дырэкцыяй. Даручыць т. Паповай (старшыня ЦП саюзу Працмастацтва) прапанаваць Пасрэдрабісу, каб ён без дазволу дырэкцыі Тэхнікуму не пасылаў студэнтаў на працу.

Т. Казакову і фракцыям належных арганізацый (Профком, Мясцком) тэрмінова рэагаваць на ўсе заметкі, якія былі зьмешчаны ў [цэн]тральных і насьценных га[зэтах], зьнішчыць вызначаныя ў і[х] хопы, мець абгаварэньне аб [...] гах і студэнтах, якія фігур[уюць у] газэтах. Выступіць у друку [...] зам на ўсе запытаньні. Пра[...] як выкананы папярэднія пас[тановы] Бюро ячэйкі аб ускрытых ра[...] дахопах па заметках у газэ[тах].

Прапанаваць камісіі вы[...] для правядзеньня дыспутаў [аб] шляхох разьвіцьця Тэхнік[уму] „якія патрэбны сучаснасьці [...]ныя спэцыялісты", паскоры[ць пра]цу з правядзеньнем дыспутаў.

Заяву т. Зайцавай (ст[...] Прафкому) аб тым, што [...] раз-жа далажыла Казакову, [...] чар прайшоў дрэнна, а та[...] яго заяву, што ён прыняў [...]ныя меры па гэтай заяве—[...] да ведама.

Праз тыдзень праверыць [выкан]аньне гэтай пастановы. Па[...] апублікаваць у друку.

Бюро ячэйкі КП(б)[Б]
16-IV—30 г. Музтэхн[ікуму]

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяш[чаючы] пастанову партыйнай [ячэйкі] Музтэхнікуму, рэдакцыя [лічыць,] што вышэйпамянёная паст[анова] ня зьнімае адказнасьці [з] ячэйкі, якое ведаючы а[б] туемым вечары, ня прын[яла на]лежных захадаў для п[...] джаньня гэтага агіднага [...]

Да усіх юнкораў „Чырвонай Зьмены"

25-ГА КРАСАВІКА ВЫХОДЗІЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫ НУМАР, ПРЫСЬВЕЧАНЫ 9-АЙ ГАДАВІНЕ ІСНАВАНЬНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ОРГАНУ КОМСАМОЛУ БЕЛАРУСІ

газэты „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

РЭДАКЦЫЯ ЗВАРАЧВАЕЦЦА ДА ЎСІХ ЮНКОРАЎ З ЗА[ЗВАЙ]ЛІКАМ АБ СВАЕЧАСОВАЙ ДАСЫЛЦЫ СВАІХ УСПАМІН[АЎ] ДА ЮБІЛЕЮ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ" ПАЖАДАНЬНЯЎ ПРАПАНОЎ.

РЭДАКЦЫЯ.

Усім ячэйкам ЛКСМБ і спэцыяліст[ам]

ЦК ЛКСМБ праводзіць вучот усіх комсамольцаў спэцыялістых адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прамысловасьці сельскай гаспадаркі (інжэнэра, тэхнікі, дырэктара заводаў, фабрык, рацыяналізатары эканамісты, майстры цэхаў, аграномы ўсіх відаў, спэцыялістыя лясной, рыбнай, тарпяной гаспадаркі, землямеры, мііарататары і г. д.).

Усе пералічаныя павінны да 20 красавіка прыслаць у ЦК ЛКСМБ наступныя аб сябе веды:

1. Прозьвішча і імя.
2. Узрост
3. Соц. становішча і паходжаньне.
4. З якога часу у ЛКСМ.
5. Партыйнасьць.
6. Дзе і ў якасьці каго працаваў (на прадпрыемстве ў с[...]дарцы) (паказаць падрабязн[а]).
7. Якую скончыў навуч[альную] установу, калі?
8 Якую працу выконваў [у вы]ворчасьці (у с-гасп.) з [часу] сканчэньня навучальнай ус[тановы].
9. Удзел у комсамольскай і соц. спаборніцтве.

Усе веды павінны быць [засведчаны] комсамольскай ячэйк[ай. Ком]самольскія ячэйкі павінны [сачыць] за правядзеньнем вучоту комсамольцаў сп[эцыялі]стых.

Загадчык мас. Эканом. А[ддзелу] ЦК ЛКСМБ РЭМІЗЭВІЧ

Загадчык Інфармацыйнаг[а ...]ру ЦК ЛКСМБ ПЕША[...]

Паведамленьні

Мен. АБ ДКО разам з акрсаветам саюзу вяўнічых Бязбожнікаў і АК МОПР'у, Акрана, склікае на 24 красавіка, а 7-й гадзіне ўвечары ў клюбе Леніна інтэрнацыянальную конфэрэнцыю піонэраў і школьнікаў, юных бязбожнікаў і юных прыяцеляў МОПР'у з наступнай абвесткай дню: 1. Далейшыя задачы інтэрнацыянальнага выхаваньня, 2. Рапарты з месц школьных ячэек МОПР'у і Бязбожнікаў, 3. Выбары дэлегатаў на ўсесаюзную конфэрэнцыю ў Маскву. [...]цьверджаньне наказаў дэ[легатам].

Сёньня 18-га красавіка, [а ... га]дзіне ўвечары ў памяшка[ньні клю]бу Карла Маркса склікаец[ца нарада] сэкратароў ячэек юных [...]нікаў і юных прыхільнікаў [...] а таксама старшынь фар[...] вучкомаў пры актыўным [удзеле] настаўнікаў школы. Яўка [...]кова, пад адказнасьць п[а] фарпосту.

— Сёньня 18-га красаві[ка, а ...] гадзіне ўвечары ў памяшка[ньні ...]му Комсамолу склікаецца [нарада] сэкратароў гар. ячэек ЛКС[М з пы]таньнем аб правядзеньні м[...] пахода арганізацыі працы [...] гасах. Яўка ўсіх сэкратар[оў аба]вязкова.

Кастрычнікавы РК ЛКСМ [паве]дамляе апоргаў і масавых [работ]нікоў ячэек аб тым. што [з ...] 1930 г. ад 6 да 8 гадз. у[...] будзецца кансультацыя т.[...]ра па пытаньнях масавай [работы] на летні час.

КУРСЫ АКЦЯБРАЦКІХ РАБОТНІКАЎ

ЗАЙМАЮЦЦА Ў ПАМЯШКАНЬНІ АКРУГКОМУ КОМСАМОЛУ, ЦІ Ў ПАКОІ ПАВАДЫРА (у двары Акругкому Комсамолу)

2, 6, 12, 16, 22, 26, а 8 гадзіне ўвечары.

Наведваць іх павінны таварышы, вылучаныя ячэйкамі і павадыры груп акцябрат.

ЧАРГОВЫЯ ЗАНЯТКІ АДБУДУЦЦА 22-га КРАСАВІКА

Акруговае Бюро ДКА.

Адказны рэдакт[ар]
Рэдкале[гія]

Галоўлітбел № 5[...]

Менск, друкарня імя тав. Сталіна